# ГАЛОЎНЫ ЎРОК

**«Нам мір завешчана берагчы!» — менавіта пад такой назвай ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі пройдзе першы ўрок у Дзень ведаў. За школьныя парты ў новым навучальным годзе ў Беларусі сядуць 110 тысяч першакласнікаў. У падарунак яны традыцыйна атрымаюць кнігу ад Прэзідэнта «Беларусь — наша Радзіма» з абноўленым мультымедыйным дадаткам.**

Усяго ва ўстановах адукацыі ўсіх узроўняў у 2016/2017 навучальным годзе будуць вучыцца каля 2 мільёнаў дзяцей, школьнікаў, навучэнцаў, студэнтаў і слухачоў. У школы і гімназіі прыйдуць больш як 982 тысячы хлопчыкаў і дзяўчатак.

У новым навучальным годзе ў краіне будуць функцыянаваць 3 167 устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, у тым ліку 210 гімназій. У ходзе аптымізацыі сеткі ўстаноў адукацыі сёлета было закрыта 67 школ і 80 навучальных устаноў рэарганізавана. Разам з тым 1 верасня для вучняў расчыняць свае дзверы і дзве новыя ўстановы адукацыі: вучэбна-педагагічны комплекс «Дзіцячы сад — пачатковая школа» на 471 месца (з іх 150 месцаў для дашкольнікаў) у Брэсце і сярэдняя школа на 510 месцаў у курортным пасёлку Нарач.

Ва ўстановах адукацыі будуць працаваць у новым навучальным годзе больш за 220 тысяч педагогаў, з якіх звыш 5,4 тысячы — гэта маладыя спецыялісты.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**
*nikalaeva@zviazda.by*

■ Першы званок

## Лілія АНАНІЧ:
# «Кожны можа стаць высокаадукаваным і паспяховым»



**Прыгожая новая школьная форма, яркія пышныя букеты, расчуленыя бацькі і ўсхваляваныя дзеці — па ўсёй краіне ўчора прайшлі ўрачыстыя лінейкі, прысвечаныя пачатку новага навучальнага года. У сталіцы сёлета за парты сядуць больш за 185 тысяч вучняў, сярод іх — 21 тысяча першакласнікаў. На трох мовах сёння віталі і ажыўленых пачаткоўцаў, і засяроджаных выпускнікоў падчас святочнай лінейкі ў сталічнай гімназіі №32.**



Фота Кастуся ДРОБАВА.

Акрамя дзвюх дзяржаўных моў — рускай і беларускай — мова міжнародных зносін, англійская, была выбрана нездарма. Гімназія славіцца высокім узроўнем выкладання гэтага прадмета. Для бацькоў многіх першакласнікаў менавіта моўны ўхіл стаў вырашальным фактарам у выбары навучальнай установы. Пасля 9-га класа вучні ўжо самі выбіраюць профіль: фізіка-матэматычны або філалагічны.

З пачаткам новага навучальнага года гімназістаў павіншавала **міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ.**

— Сёння ў Беларусі цудоўны мірны дзень, — сказала яна. — Тысячы і тысячы дзяўчат і хлопцаў — хто зноў, а хто і ў першыню — пераступаюць парогі школ, каб разам з настаўнікамі пры падтрымцы сваіх бацькоў, атрымаць фундаментальныя веды і стаць адказнымі грамадзянамі рэспублікі, патрыётамі сваёй краіны. У нашай дзяржаве робіцца ўсё магчымае, каб кожны малады чалавек мог стаць высокаадукаваным і, калі казаць сучаснай мовай, паспяховым.

Звяртаючыся да педагогаў, міністр адзначыла, што яны з пакалення ў пакаленне сумленна ўкладаюць у нашых дзяцей сэрцы і душы, не толькі дзелячыся з імі сваімі ведамі, але і дапамагаючы ўздымацца па першых жыццёвых прыступках.

А вось для выпускнікоў гэта фінальны год. «Галоўнае — не толькі марыць аб вялікай будучыні, але і на справе падтрымліваць высокую планку», — сказала Лілія Ананіч.

Паводле яе слоў, у нашай краіне маюцца ўсе ўмовы, каб кожны новы навучальны год пачынаўся прыгожа і быў паўнавартасным. «Нашы дзеці, — сказала Лілія Станіславаўна, — прыгожа апрануты, упакаваныя іх заплечнікі — пасталаліся беларускія прадпрыемствы. Падрыхтаваліся да гэтага і беларускія кнігавыдаўцы: яны забяспечылі выпуск падручнікаў для агульнаадукацыйных школ і для вышэйшых навучальных устаноў».

Міністр інфармацыі адзначыла таксама, што галоўны атрыбут адукацыйнага працэсу — друкаваная кніга, да таго ж у наступным годзе будзе святкавацца 500-годдзе беларускага кнігадрукавання, таму бібліятэка гімназіі ў гонар свята папоўнілася кнігамі пра Францыска Скарыну — «Чалавек свету» і «Чалавек-энцыклапедыя».

**Дар'я КАСКО.**
*kasko@zviazda.by*

# ПЛЁННА ВУЧЫЦЦА ДАПАМОЖА КАПРАМОНТ

## Школы Рагачова падрыхтаваліся да Дзён ведаў і пісьменства

**Сёння на Гомельшчыне за парты селі больш як 150 тысяч вучняў. У Рагачоўскім раёне, дзе праходзіць апошняя падрыхтоўка да Дня беларускай пісьменства, каля шасці тысяч дзяцей надзелі школьную форму. Для навучэнцаў сярэдняй школы №3 горада Рагачова Дзень ведаў сёлета асаблівы. Установа адукацыі была пабудавана паўстагоддзя таму і апошнім часам патрабавала капітальнага рамонту. У планах старшыні Гомельскага аблвыканкама Уладзіміра Дворніка наведаць школу 1 верасня, каб ацаніць рамонт і натхніць вучняў на плённую працу.**



Рэканструкцыя ў школе пачалася ў чэрвені. За тры месяцы, дзякуючы агульным намаганням будаўнікоў і валанцёраў школа і тэрыторыя навокал змяніліся да непазнавальнасці.

— Бралі ўдзел і бацькі, шчыры ім дзякуй, і дзеці, і валанцёры — як Жлобінскага раёна, так і нашага, — расказвае **дырэктар Ігар ЖДАНАЎ.**

На рамонт школы было выдзелена звыш 1 млн дэнамінаваных рублёў. За кошт гэтых сродкаў зроблены капітальны рамонт даху, фасада, добраўпарадкавана тэрыторыя з заменай асфальтавага пакрыцця, агароджы, спартпляцовак. У будынку заменены вокны, абмантаваны навучальныя кабінеты, калідоры, набыты камп'ютарны клас з інтэрактыўнай дошкай і мэбля для вучняў. Сёлета тут за парты сядзе амаль 400 школьнікаў. Нядаўна сярод іх была і Соф'я Юрчанка (Міхейчык), якая цяпер — член зборнай Беларусі па веславанні на байдарках і каноэ. Яна сярэбраная прызёрка чэмпіянату Еўропы, пераможца сусветнай універсіяды ў Казані.

Змены закранулі і школу №2 у Рагачове. Тут галоўны акцэнт зроблены на рамонце кабінетаў, пераважна гаспадарчым спосабам. Да таго ж пераабсталявалі стадыён і прывялі ў парадак тэрыторыю. Дзеці, якія прыходзілі ў аздараўленчыя лагеры, не толькі ўдзельнічалі ў разнастайных забаўляльных мерапрыемствах, але і аказвалі актыўную дапамогу настаўнікам пры падрыхтоўцы да новага навучальнага года.

Прыведзены ў парадак і ўстановы ў сельскай мясцовасці. У Гарадзецкай дапаможнай школе-інтэрнаце на Рагачоўшчыне, дзе навучаецца і пражывае каля 100 дзяцей, якія апынуліся ў няпростай жыццёвай сітуацыі, рэалізаваны замежны праект. Як расказаў **дырэктар гарадзецкай дапаможнай школы-інтэрната Ігар ЧЫГУНКОЎ**, італьянскі фонд «Дапамажам ім жыць» аказаў спонсарскую дапамогу ўстанове больш як на 50 тысяч еўра:

— Італьянскія валанцёры працавалі два тыдні, за гэты час шмат чаго паспелі. Зрабілі нам асобны душавы пакой, што дазваляе адмовіцца ад паслуг лазні, куды мы раней вазілі дзяцей. У фінансавым плане гэта дапаможа сэканоміць за год больш за 100 мільёнаў рублёў. Цяпер дзеці будуць мыцца непасрэдна ў школе.

Дададзім, што на Гомельшчыне каля 27,5 тысячы школьнікаў са шматдзетных сем'яў атрымалі дапамогу да новага навучальнага года.

**Ірына АСТАШКЕВІЧ.** *iost@zviazda.by*

# Партфель для першакласніка і прэмія выдатніку

**Першакласнікі, чые бацькі працуюць у трэсце «Гроднагарбуд», атрымалі ў падарунак партфелі.**

Акрамя таго, прафсаюзны камітэт прадпрыемства закупіў для 50 дзяцей, якія сёлета ўпершыню сядуць за школьныя парты, поўны камплект канцылярскіх прылад — сшыткі, ручкі, алоўкі, пеналы і іншае.

А ў гродзенскай кампаніі «Малочны свет» ужо па добрай традыцыі ўзнагародзілі дзяцей работнікаў прадпрыемства за выдатную вучобу. Грашовыя прэміі атрымалі больш за сто выдатнікаў — школьнікі з Гродна, Скідзеля і Бераставіцы, а таксама студэнты вышэйшых і сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў. На свята з нагоды пачатку новага навучальнага года запрасілі і выхаванцаў Гродзенскага дзіцячага хоспіса, дзіцячага сацыяльнага прытулку, падшэфных прыёмных сем'яў. Усе ахвотныя разам з мастакамі-графіцістамі паўдзельнічалі ў роспісе двухсотметровай бетоннай сцяны на тэрыторыі прадпрыемства, і ў выніку атрымаўся арт-аб'ект з выявай малочных прадуктаў. Для гэтай акцыі прадпрыемства «Малочны свет» купіла больш за 100 балонаў з аэразольнай фарбай у кампаніі «ОБК», якая пералічыла выручаныя грошы на рахунак Гродзенскага дзіцячага хоспіса.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.** *prakopchik@zviazda.by*

# ПА НОВЫМ ПРАЕКЦЕ

**У курортным пасёлку Нарач, што ў Мядзельскім раёне, 1 верасня гасцінна расчыніць дзверы новая школа на 510 месцаў, дзе будуць вучыцца дзеці з 1-га па 11-ты клас у адну змену.**

У школе створаны ўсе ўмовы як для вучобы, так і для фізічнага развіцця школьнікаў. Тут прадугледжана спартыўная зала плошчай 540 квадратных метраў з пляцоўкамі для заняткаў рознымі відамі спорту, а таксама трэнажорная зала амаль на 100 квадратаў. Ёсць і актавая зала на 152 месцы з сучасным асвятленнем, сцэнай. Акрамя таго, у новым будынку размясціліся кабінеты інфарматыкі, фізікі, хіміі, біялогіі, майстэрні тэхнічнай абслуговай працы для хлопчыкаў і дзяўчатак. Уражвае і спартыўная вонкавая зона: вялікі стадыён, пляцоўкі для навучальнага працэсу і пазакласнай работы: геаграфічная, па вывучэнні правіл дарожнага руху. Яны выкананы з дапамогай сучаснага пакрыцця на аснове гумавай крошкі, у спалучэнні з газонамі, тратуарнай пліткай, асфальтам.

За аснову ўзяты праект, што рэалізаваны ў Астраўцы Гродзенскай вобласці. Але на Міншчыне яго цалкам адаптавалі да мясцовых умоў, да ўжо існуючай інжынернай інфраструктуры: водаправодных, электрычных, каналізацыйных, ацяпляльных сетак. Усё гэта дазволіла зрабіць кошт будаўніцтва больш танным. Гэты праект максімальна просты, але прадугледжвае ўсё неабходнае, каб якасна арганізаваць навучальна-выхаваўчы працэс у адну змену.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** *lazovskaya@zviazda.by*

# Банк развіцця падорыць аўтобусы

**Старшыня праўлення «Банка развіцця Рэспублікі Беларусь» Сяргей Румас перадасць 10 школьных аўтобусаў МАЗ мадэлі 241S30 упраўленню адукацыі Магілёўскага абласнога выканаўчага камітэта.**

Перадача аўтобусаў пройдзе ў рамках праграмы, якая рэалізуецца банкам і прадугледжвае набыццё на працягу 2013—2017 гадоў не менш як 300 адзінак спецыяльна абсталяваных школьных аўтобусаў. Плануецца, што праграма дазволіць цалкам вырашыць праблему забеспячэння падвозу дзяцей у сельскай мясцовасці да месцаў навучання і назад.

Пасля заканчэння ўрачыстай цырымоніі адбудзецца прэзентацыя новай мадэлі школьнага аўтобуса МАЗ 257, а таксама наведванне лабараторыі, абсталяванай аргтэхнікай, якая была выкарыстана падчас распрацоўкі новай мадэлі. Спонсарская дапамога на закупку гэтай тэхнікі была аказана Банкам развіцця. Дарэчы, такім жа чынам летась была прадстаўлена ўдасканаленая мадэль аўтобусаў 241S30, на якой ужо ў гэтым годзе ў школу будуць ездзіць маленькія жыхары Магілёўшчыны.

Стварэнне новай мадэлі школьнага аўтобуса МАЗ 257 праводзілася з улікам водгукаў і пажаданняў арганізацый, якія непасрэдна карыстаюцца аўтобусамі. Адначасова на ім можна перавозіць да 28 школьнікаў. Кожнае месца абсталявана чатырохкропкавымі рамянямі бяспекі. Усе астатнія змены і ўдасканаленні канструкцыі новага школьнага аўтобуса дазволяць зрабіць рух па сельскіх дарогах больш бяспечным.

**Вераніка ПУСТАВІТ.** *pustavit@zviazda.by*

# ПАДАРУНАК ДЛЯ САМЫХ МАЛЕНЬКІХ

**Вялікім падарункам для жыхароў сталічнага мікрараёна Каменная Горка-3 стала адкрыццё ў канцы жніўня новага дзіцячага садка №285.**

Дашкольная ўстанова размяшчаецца па адрасе: вул. Каменнагорская, 106. Садок абсталяваны ўсім неабходным для камфортнага знаходжання і развіцця дашкольнікаў. У новай навучальнай установе ёсць спартыўная і трэнажорная залы, басейн, універсальная прастора для заняткаў эстэтычнай накіраванасці. Дзеці таксама змогуць добра запомніць правілы дарожнага руху — на тэрыторыі ёсць спецыяльная пляцоўка для іх вывучэння. Садок гатовы прыняць 230 хлопчыкаў і дзяўчынак.

Новая школа таксама павінна ў хуткім часе з'явіцца ў сталічным мікрараёне Масюкоўшчына — яе здача запланавана на наступны каляндарны год.

Сёлета ў Мінску былі праведзены работы па капрамонце будынкаў 12 устаноў агульнай сярэдняй адукацыі, у 8 з іх быў комплексны капрамонт.

**Дар'я КАСКО.** *kasko@zviazda.by*